**І.А.Алексніна,** *кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт*

# БРАСЛАЎСКІ НАРОДНЫ ТЭАТР: ТРАДЫЦЫІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

У сучасным тэатральным мастацтве аматарскаму (у тым ліку і народнаму) тэатру адводзіцца, можна сказаць, сціплае месца. Праблема даследавання традыцый і перспектыў развіцця вядучых аматарскіх тэатральных калектываў Беларусі застаецца такой жа актуальнай, як і раней. Гэта не стасуецца з той роляй, якую бесперапынна, ад самага свайго нараджэння, выконвае аматарскі тэатр па мастацкім выхаванні, асвеце шырокага кола беларускага грамадства.

Аматарскі тэатр застаецца значнай састаўной часткай нацыянальнай тэатральнай культуры. Прафесійныя тэатры працуюць толькі ў Мінску і абласных гарадах. Існаваўшая ў 1970–80-я гг. сістэма арганізацыі выязных спектакляў, якая давала магчымасць сустрэчы з мастацтвам жыхарам многіх гарадоў і вёсак, сёння праблематычная, і перш за ўсё па эканамічных прычынах. Гэту функцыю далучэння як мага большай колькасці людзей да мастацтва, рэалізацыі іх патрэбнасцей у прыгожым у значнай ступені выконвае аматарскі тэатр. Адзначым таксама, што многія з тых, хто займаецца прафесійным тэатрам, з'яўляюцца выхадцамі з так званай тэатральнай "глыбінкі". Да таго ж аматарскі тэатр тым і адрозніваецца ад прафесійнага, што ў ім кожны жадаючы можа стаць актыўным удзельнікам у працэсе стварэння тэатральнай дзеі, тады як ў прафесійным тэатры нават самы лепшы глядач застаецца гледачом. Безумоўна, што ролю гледача ў стварэнні спектакля цяжка пераацаніць, але для аматарскага тэатра выхаванне гледача ёсць адна з асноўных функцый. Яшчэ адной функцыяй аматарскага тэатра, найбольш значнай, на наш погляд, сёння застаецца магчымасць раскрыцця і развіцця асобасных і творчых здольнасцей усіх, хто прыходзіць у тэатр ці з мэтай выступаць на сцэне, ці як глядач.

Кожны тэатр мае адметныя творчыя рысы, мастацка-эстэтычныя здабыткі і традыцыі. Адным са старэйшых аматарскіх тэатраў нашай краіны з'яўляецца Браслаўскі народны тэатр – лаўрэат II Усесаюзнага фестывалю, уладальнік пераходнага Чырвонага Сцяга, трох рэспубліканскіх прэмій, занесены ў 1960-я гг. у

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Рэспубліканскую Кнігу гонару, удзельнік і пераможца шматлікіх раённых, абласных і рэспубліканскіх аглядаў мастацкай самадзейнасці, дэкад, аматарскіх тэатральных фестываляў, тэатр, які карыстаўся папулярнасцю не толькі ў Беларусі, але і ў Латвіі, Літве. Шэфства над тэатрам неаднаразова браў Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я.Коласа (напрыклад, народныя артысты БССР М.Бялінская і І.Матусевіч дапамагалі ў пастаноўцы “Выбачайце, калі ласка!” А.Макаёнка – аднаго з лепшых спектакляў у рэпертуары тэатра, пасля якога тэатр атрымаў званне “народны”).

Сярод лепшых кіраўнікоў тэатра А.Ламберт, В.Галкін, У.Сівіцкі, Э.Багдановіч, І.Крот. Сёння тэатрам кіруе малады рэжысёр Я.Набіеў. Сярод лепшых акцёраў – М.Вароніна, Г.Міцкевіч, М.Драбовіч, Т.Галімская, Г.Жук, В.Брылевіч, Л.Галаенка, Т.Дынкіна, А.Міхайлаў, С.Закрэўская (Цыунэль), Л.Рэмер і інш. Яркі след у жыцці тэатра і ў памяці гледачоў пакінулі не толькі яго кіраўнікі і выканаўцы, але і касцюмер К.У.Ламберт, мастакі-дэкаратары І.Рыдзіка і А.Седзюкевіч. Шмат каму тэатр адчыніў дзверы і ў прафесійнае мастацтва.

Драмгурток, з якога пазней вырас сталы мастацкі калектыў, быў створаны дырэктарам гарадскога Дома культуры А.Х.Ламбертам пасля вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў – у кастрычніку 1944 г. Перыяд творчага росквіту прыпадае на канец 1940-га – канец 1960-х гг. і звязаны з працай рэжысёра, былога акцёра Трэцяга беларускага тэатра пад кіраўніцтвам У.І.Галубка Васіля Пятровіча Галкіна. Усяго за час працы ў калектыве браслаўскі рэжысёр паказаў шырокаму колу гледачоў больш тысячы спектакляў. За 25-гадовы перыяд працы на пасадзе кіраўніка В.Галкін даў сцэнічнае жыццё больш як сарака пяці шматактовым і сотні аднаактовым творам.

Афішу тэатра ў асноўным складае рускамоўная і беларуская драматургія. З 45 шматактовых спектакляў 46,6% паказаны на рускай мове. Прыкладна такую ж лічбу ў працэнтных адносінах складаюць і пастаноўкі па творах беларускай драматургіі. Астатнія 6,8 % – п‘есы замежных аўтараў. У жанравых адносінах найчасцей ставіліся і ставяцца п’есы камедыйнага плана, музычныя вадэвілі, скетчы, інтэрмедыі. Асаблівай павагай карыстаюцца творы А.Я.Макаёнка, класіка беларускай камедыі. Кіраўнік тэатра В.П.Галкін лічыў, што творы гэтага нацыянальнага класіка вельмі актуальныя. Яны напісаны сакавітай народнай мовай, хвалююць,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

выклікаюць роздум. Вобразы, створаныя драматургам, вельмі актуальныя, каларытныя, над імі цікава працаваць.

У час спектакля “Трыбунал” на сцэне Рэспубліканскага тэатра юнага гледача 23 сакавіка 1973 г. у зале прысутнічаў драматург. Пасля спектакля Андрэй Ягоравіч адзначыў цікавую рэжысуру, добрае акцёрскае выкананне, мастацкае афармленне. За акцёрскую працу дыпломамі былі адзначаны артысты тэатра Л.Галаенка, Е.Індзюкова, М.Затылкіна, В.Есіпёнак, Г.Міцкевіч, а сам спектакль атрымаў дыплом II ступені.

З нацыянальнай драматургіі ў Браслаўскім народным тэатры ставяцца “Прымакі”, “Паўлінка” Я.Купалы; “Хто смяецца апошнім” К.Крапівы; “Залёты”, “Пінская шляхта” В.Дуніна-Марцінкевіча; “Не верце цішыні” І.Шамякіна; “Выбачайце, калі ласка!”, “Лявоніха на арбіце”, “Таблетку пад язык”, “Трыбунал”, “Зацюканы апостал” А.Макаёнка; «Мікітаў лапаць” М.Чарота (рэж. У.Сівіцкі), “Пайсці і не вярнуцца” паводле В.Быкава (рэж. Э.Багдановіч); “Купальская ноч” А.Дударава і інш. З рускай класікі перавага аддаецца творам вялікага камедыёграфа А.Астроўскага. На сцэне народнага тэатра ў розныя гады ішлі “Позняе каханне”, “Мінулася кату масленіца” (рэжысёр В.Галкін).

З ліку найбольш паспяховых шматактовых пастановак, створаных у розныя гады ў Браслаўскім народным тэатры, – “Плошча кветак” В.Ільенкава, “Калінавы гай” А.Карнейчука, “Прымакі” Я.Купалы (рэж. А.Ламберт), “Сады цвітуць” А.Мааса і Кулічэнкі, «Мама сказала “Не!”» А.Уладзімскага, “Пад дзікай яблыняй” Я.Раймонда, “Фараоны” А.Каламійца, “Галасееўскі лес” В.Сяўко, “Паўлінка” Я.Купалы (рэж. В.Галкін); “Пайсці і не вярнуцца” В.Быкава (рэж. Э.Багдановіч); “Паўлінка” Я.Купалы, “Правінцыялкі” Я.Стэльмаха, “Купальская ноч” А.Дударава (рэж. І.Крот). Выпускнік Мінскага інстытута культуры (зараз Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў) Ігар Германавіч Крот, які амаль 10 гадоў працаваў рэжысёрам тэатра, запомніўся гледачам не толькі як аўтар цікавых пастановак, таленавіты акцёр, стваральнік і кіраўнік маладзёжнай групы тэатра, але і як аўтар і пастаноўшчык п’ес “Мужчына за грошы” і “Абраз”. Галоўная праблема, якую закранае драматург і рэжысёр у сваіх творах, гэта бездухоўнасць грамадства, яго абыякавасць і жорсткасць ў адносінах да чалавека і асобы, праблема грамадства, дзе “грошы вырашаюць усё”.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Ва ўсіх спектаклях народнага тэатра багата музыкі, песень, танцаў. Тэатр плённа выкарыстоўвае пастановачны і арганізацыйны вопыт І.Ц.Буйніцкага і У.І.Галубка. Асабліва відавочна гэта выяўляецца ў доўгачасовым захаванні “вечарынкавай” асновы (асабліва ў час кіраўніцтва тэатрам В.П.Галкіным).

Шматразовыя паказы сцэнічных твораў рэгулярна ладзяцца на пляцоўках мястэчак і вёсак, карыстаюцца поспехам у глядацкай аўдыторыі Полацка, Віцебска, Маладзечна, Мінска, Шаўляя, Даўгаўпілса, Краславы, Ігналіны. У 1940–1970-я гг. гастрольная дзейнасць тэатра арганізоўвалася В.П.Галкіным на такім узроўні, што калектыў тэатра зарабляў немалыя сродкі на набыццё грыму, рэквізіту, касцюмы, мастацкае афармленне спектакляў. Акрамя таго, ён аказваў значную практычную дапамогу ў пашырэнні сеткі арганізаванай тэатральнай самадзейнасці, павышэнні якасці работ вясковых аматараў, забеспячэнні драмгурткоў рэпертуарам.

7 лістапада 2008 г. Браслаўскі народны тэатр адзначыў свой паўвекавы юбілей. Сёння тэатрам кіруе малады рэжысёр Яўген Набіеў. У сваёй дзейнасці ён імкнецца не толькі захаваць 50-гадовыя традыцыі тэатра, але і знайсці новыя шляхі развіцця, якія б адпавядалі сучаснасці. Рэпертуарная палітыка будуецца ім на аснове камедыйных твораў. Зараз вядзецца работа над камедыяй Л.Філатава “Пра Фядота-стральца, удалога малайца”, працуе тэатр мініяцюр. Кіраўнік тэатра выступае не толькі як рэжысёр, але і як драматург. Ён прызнае, што праблемы з жадаючымі браць удзел у дзейнасці тэатра няма, для адбору акцёраў даводзіцца нават праводзіць кастынг. Гэты факт яшчэ раз падцвярджае, што роля аматарскага тэатра сёння вельмі значная, асабліва ва ўмовах, калі адсутнічае прафесійны тэатр. Тут неабходны пэўныя дзяржаўныя меры па ўмацаванні і захаванні ролі і статусу аматарскага тэатра ў жыцці сучаснага беларускага грамадства, для таго каб ён мог выконваць свае найважнейшыя функцыі знаёмства з тэатральным мастацтвам, выхавання гледача для прафесійнага тэатра, творчага раскрыцця і развіцця асобы ўдзельніка калектыву.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ